# Першы атрад беларускіх горнахімікаў

Гэтымі днямі ў Салігорскім горнахімічным тэхнікуме завяршылі абарону дыпломных праектаў 33 студэнты вячэрняга аддзялення. Гэта першы выпуск новай навучальнай установы. Усе выпускнікі заняты непасрэдна на вытворчасці на Першым калійным камбінаце. Сярод іх — майстры В. Ф. Філановіч, Г. Я. Бурцава, М. Т. Мацукевіч, старшыя апаратчыкі абагачальнай фабрыкі М. І. Седнева, В.В. Садзюковіч, Е. І. Луганцова і іншыя. Яны атрымліваюць дыпломы тэхнікаў - тэхнолагаў па вытворчасці мінеральных угнаенняў і кіслот.

Цяпер у навучальнай установе на дзённым аддзяленні вучыцца 427 і на вячэрнім —512 чалавек.